***Юлія Амосава***
*(Мінск)*

# РАСКРЫЦЦЁ ФОНДАЎ ЛІТАРАТУРНАГА МУЗЕЯ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА Ў ВІРТУАЛЬНЫМ ПРАЕКЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ “НА ХВАЛІ ЧАСУ, У ПЛЫНІ ЖЫЦЦЯ”

Адным з важных напрамкаў дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з’яўляецца стварэнне віртуальных праектаў, якія папулярызуюць спадчыну выбітных прадстаўнікоў беларускай культуры, значныя гістарычныя падзеі, рэкламуюць фонды бібліятэкі, прадстаўляюць свабодны доступ да поўных тэкстаў каштоўных дакументаў, кніг і артыкулаў з магчымасцю іх спампоўвання. У 2019 г. была распачата праца над маштабным рэсурсам “На хвалі часу, у плыні жыцця”, які прысвечаны 100-годдзю Усебеларускага літаратурнага аб’яднання паэтаў і пісьменнікаў “Маладняк”. Партнёрамі праекта з’яўляюцца Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва і часопіс “Маладосць”. Размешчаны рэсурс на галоўнай старонцы інтэрнэт-партала бібліятэкі і даступны кожнаму карыстальніку. Праект складаюць асобныя віртуальныя раздзелы, якія ствараюцца да юбілеяў маладнякоўцаў. Так, ужо прэзентаваны раздзелы да 110-годдзя Валерыя Маракова, 120-годдзя Адама Бабарэкі, да 115-годдзя Уладзіміра Хадыкі. У ліпені была прадстаўлена відэапрэзентацыя раздзела, прысвечанага 120-годдзю Уладзіміра Дубоўкі. Ужо падрыхтаваны раздзел да 115-годдзя Янкі Скрыгана, збіраецца матэрыял да 115-годдзя Андрэя Александровіча, плануецца шэраг наступных юбілейных праектаў.

У чэрвені адбылася відэапрэзентацыя раздзела, прысвечанага 120-годдзю Кузьмы Чорнага. Віртуальныя матэрыялы знаёмяць з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка, з яго літаратурнай спадчынай, крытычнымі крыніцамі пра празаіка, пастаноўкамі твораў Чорнага ў беларускіх тэатрах, фотаздымкамі, рукапісамі, асабістымі рэчамі пісьменніка, ушанаваннем яго памяці.

Падчас стварэння праекта бібліятэка наладзіла сумесную працу з Літаратурным музеем Кузьмы Чорнага, які знаходзіцца ў аграгарадку Цімкавічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці і з’яўляецца філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Менавіта з Цімкавічамі былі звязаны адны з лепшых успамінаў пісьменніка, бо там прайшло яго дзяцінства і юнацтва. Нягледзячы на цяжкае, галоднае жыццё, калі, па ўспамінах Чорнага, “кавалак хлеба і палатняная рубашка — адна на год, здаваліся шчасцем”, пісьменнік на працягу ўсяго

жыцця ўзгадваў Цімкавічы, марыў вярнуцца туды і адпачыць душой [2, с. 10]. Правобразы жыхароў Цімкавіч, суседзяў, шматлікіх знаёмых, аднавяскоўцаў, сяброў, асаблівасці іх гаворкі прысутнічаюць амаль у кожным творы празаіка, а сам пісьменнік прызнаваўся, што апісваць цімкаўцаў яму хапіла б на ўсё жыццё.

Каштоўныя матэрыялы, фотаздымкі з фондаў Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага ўвайшлі ў раздзел "Жыццёвы і творчы шлях", "Фотагалерэя" і "Ушанаванне памяці". Так, прыцягваюць увагу малюнкі пісьменніка. Вядома, што ён быў рознабаковым, адораным чалавекам: іграў на балалайцы, фісгармоніі, піяніна, у дзяцінстве спяваў разам з маці ў Скіп'ёўскім царкоўным хоры, меў акцёрскія здольнасці, спрабаваў сябе ў ролі мастака. Праект дае магчымасць убачыць малюнкі Кузьмы Чорнага, якія ўяўляюць сабой ілюстрацыі да рамана "Пошукі будучыні", які ўпершыню быў апублікаваны ў часопісе "Полымя" ў 1950 г. Гэты раман празаік ствараў пасля перанесенага інсульту, калі пачаў губляць зрок, таму прыходзілася браць ліст паперы, класці на яго трафарэт і пісаць, намацваючы пальцамі радкі. Пра гэта Кузьма Чорны піша ў сваім дзённіку ад 2 ліпеня 1944 г.: "А яшчэ шэсць месяцаў таму, калі пачынаў перапісваць "Пошукі будучыні", мне была пакута выпісваць роўна загаловак і першы радок. Я цыркулем мераў раўналежнасць радка ад берага паперы" [3, с. 579]. У гэтым сэнсе, здзіўляе, што, нягледзячы на амаль поўную слепату, пісьменнік стварыў яшчэ і малюнкі да свайго рамана. На адной з ілюстрацый можна ўбачыць высокае дрэва і драўляны будынак, верагодна, гэта гумно з шырокімі варотамі, а каля сцяны знаходзіцца фрагмент агароджы. У праекце размешчаны і два іншыя малюнкі Кузьмы Чорнага, створаныя таксама ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Сёння яны з'яўляюцца неад'емнай часткай экспазіцыі музея пісьменніка ў Цімкавічах і ўвасоблены ў павялічаных аплікацыях.

Сярод матэрыялаў рэсурса ёсць фотаздымкі рэчаў Кузьмы Чорнага з музейных фондаў, напрыклад, самавар — набытак музея перыяду 1980-х гг., калі яму было нададзена званне народнага. У слайдары прадстаўлена паліто пісьменніка, якое ён насіў у 1930-я гг. Фасон адпавядае тагачаснай модзе: гэта класічная драпавая двухбортная верхняя вопратка з дзвюма кішэнямі па баках.

Добра дапаўняюць віртуальны праект і музейныя фотаздымкі прадметаў побыту сям'і Раманоўскіх (Раманоўскі — сапраўднае прозвішча Кузьмы Чорнага). Цікавасць выклікае абрус, вытканы маці пісьменніка, Глікер'яй Міхайлаўнай. Трэба адзначыць, што ткацтва было неад'емнай часткай жыцця продкаў будучага празаіка: яго дзяды Міхал Парыбак і Фелікс Раманоўскі былі ткачамі-сурвэтнікамі. Маці пісьменніка села за варштат ткаць сурвэты ды ручнікі, калі ёй было гадоў чатырнаццаць, бо гэты занятак быў у іх фамільным, перадаваўся з пакалення ў пакаленне, таму пад гукі варштата вырас і Мікола Раманоўскі.

Глікер'я Міхайлаўна была жанчынай простай, але начытанай і мудрай. Калісьці з-за беднасці, не маючы магчымасці вучыцца, яна цвёрда намерылася даць добрую адукацыю сваім дзецям. Яна рана заўважыла цікавасць старэйшага сына Міколы да чытання, марыла вывесці яго ў людзі, пазбавіць ад цяжкага лёсу панскіх парабкаў, якімі былі яе продкі. Каб зарабіць на адукацыю дзецям, яна шмат часу праводзіла за кроснамі, кажучы мужу: "Няўжо мы з табою нашага Коліка не пашлём у школу? Я буду дзень і ноч сядзець за варштатам, адно толькі каб сынок вучыўся..." [1, с. 15]. Характэрна, што сам пісьменнік таксама быў добра знаёмы з майстэрствам ткачоў, ведаў асаблівасці гэтай справы, аб чым сведчыць яго артыкул "Слуцкія сурвэты" 1944 г., дзе ён падрабязна апісаў варштат і працэс працы на ім з усёй адпаведнай тэрміналогіяй. Там жа ён узгадаў і сваю маці: "Выдатная сурвэтніца, дачка Міхала Парыбка, Глікерыя, прозвішча па мужу Раманоўская, памерла ў 1921 годзе. Пасля яе астаўся вялікі сшытак, дзе былі вырысаваны бацькам і братам яе ўсе дасэні, якія толькі былі" [4, с. 578]. Невыпадкова, што ў адной з залаў Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага знаходзяцца кросны, як памяць аб маці і дзеду. Фотаздымкі абруса і варштата, якія набываюць сэнс своеасаблівых сімвалаў для раскрыцця ўнутранага свету пісьменніка, размешчаны ў праекце "На хвалі часу, у плыні жыцця".

У рэсурс уключаны шэраг фотаздымкаў, на якіх можна ўбачыць залы Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага, фатаграфіі яго асобных экспанатаў, напрыклад, пісьмовы стол пісьменніка, памятная дошка на будынку музея. Прадстаўлена копія пейзажу "Скіп'ёўскі лес" работы мастака Віктара Барабанцава, які адлюстроўвае любімыя мясціны дзяцінства пісьменніка. Чорны з маленства захапляўся прыродай, у чым была заслуга і маці, і дзеда Міхала, што шмат часу прысвячалі шпацырам з дзецьмі па родных куточках, гулялі ў Скіп'ёўскім лесе, які знаходзіўся за чатыры-пяць кіламетраў ад Цімкавіч. Там яны любаваліся веліччу дрэў, слухалі як "хвоі гавораць", атрымлівалі асалоду ад спеваў птушак. На падставе работы Віктара Барабанцава можна ўявіць тыя мясціны, што паўстаюць у творах Кузьмы Чорнага, напрыклад, у яго незавершанай аповесці "Скіп'ёўскі лес".

Праект прадстаўляе вобраз Кузьмы Чорнага ў творчасці беларускіх мастакоў. Так, можна ўбачыць скульптурны партрэт пісьменніка работы Паўла Лука з фондаў цімкавіцкага музея, выкананы ў матэрыяле бронзы. Скульптар адлюстраваў Кузьму Чорнага ў маладым узросце, верагодна гэта 1925–1930 гг. Партрэт зроблены з вядомых фотаздымкаў пісьменніка маладнякоўскага і ўзвышаўскага перыядаў.

Сёння музей Кузьмы Чорнага — гэта значны культурны і асветніцкі цэнтр. Яго экспазіцыя размешчана ў пяці залах і ўсебакова раскрывае творчую асобу Кузьмы Чорнага. У музеі можна ўбачыць не толькі асабістыя рэчы пісьменніка, фотаздымкі з сямейнага альбома, яго рукапісы і малюнкі, але і пачуць голас Кузьмы Чорнага, зафіксаваны

на магнітнай стужцы. Пры музеі працуе студыя аматараў тэатра "Іскрынка". У розныя гады яе ўдзельнікі інсцэніравалі апавяданні празаіка, ставілі аповесць "Насцечка", п'есу "Базылевічава сям'я". З гэтымі спектаклямі артысты перыядычна выступаюць перад мясцовымі жыхарамі і гасцямі Цімкавіч.

Такім чынам, дзякуючы супрацоўніцтву Нацыянальнай бібліятэкі з Літаратурным музеем Кузьмы Чорнага, праект "На хвалі часу, у плыні жыцця" папоўніўся каштоўнымі матэрыяламі, якія дапамагаюць лепш уявіць сабе гэтага таленавітага чалавека, яго ўнутраны свет, асаблівасці жыцця, сямейных традыцый і яго эпохі.

**Літаратура**


1. Александровіч, С. Сэрца, у якім месціцца цэлы свет / С. Александровіч // Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Г. Шаблінская]. – Мінск : Маст. літ., 2016. – 510 с., іл., партр., факсім. : партр.
2. Чорны, К. Аўтабіяграфія / К. Чорны // Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Г. Шаблінская]. – Мінск : Маст. літ., 2016. – 510 с., іл., партр., факсім. : партр.
3. Чорны, К. Дзённік / К. Чорны // Выбраныя творы / К. Чорны ; [Уклад. і прадм. М. Тычыны ; камент. М. Тычыны і Я. Янушкевіча]. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – 605 с.
4. Чорны, К. Слуцкія сурвэты / К. Чорны // Выбраныя творы / К. Чорны ; [Уклад. і прадм. М. Тычыны ; камент. М. Тычыны і Я. Янушкевіча]. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – 605 с.